наша СЛОВА № 33 (1080) 15 ЖНІЎНЯ 2012 г.

# У лепшых традыцыях кнігадрукавання





6 жніўня, у Дзень беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання, 495 гадоў таму, калі асветнік і гуманіст Францішак Скарына выдаў "Псалтыр" ў Празе, новае энцыклапедычнае выданне "Краіна Беларусь. Вялікае Княства Літоўскае" прадставіў у бібліятэцы Нацыянальнай Акадэміі навук творчы калектыў на чале з пісьменнікам Уладзімірам Арловым, мастаком і дызайнерам Змітром Герасімовічам, рэдактарам Змітром Санько.

Аўтар гістарычных апавяданняў, хронікаў, нарысаў і эсэ Уладзімір Аляксеевіч Арлоў добра вядомы чытачам па кнігах "Імёны свабоды", "Краіна Беларусь", "Сланы Ганібала". Кнігі лаўрэата літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча і прэміі імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра, а таксама Міжнароднай літаратурнай прэміі "Еўрапейскі паэт Свабоды" пераведзеныя на 25 моваў, і асноўныя еўрапейскія

Мастак жа, той хто падбіраў ілюстрацыі і форму, як Скарына выбіраў буквіцы і колер, часцей застаецца ў цяні невядомасці. Таму мы пагутарылі з суаўтарам У. Арлова - Дзмітрыем Эдуардавічам Герасімовічам.

Дзмітры Эдуардавічам жыве і працуе ў Менску. Ён мае дзве вышэйшыя адукацыі, скончыў Вышэйшыя кінакурсы пры ВДІКу ў Маскве, потым - Львоўскі паліграфічны інстытут, які зараз з'яўляецца Акадэміяй. Пэўны час ён меў кнігадрукарскую практыку за мяжой.

У канцы 90-тых гадоў ён вярнуўся на Беларусь і шчыльна заняўся кнігавыдавецкай справай. У суаўтарстве з гісторыкамі і фотамастакамі ім былі выдадзены больш за 20 сур'ёзных энцыклапедычных выданняў гістарычнага кірунку, а таксама невялікія брашуры і фотаальбомы.

Сумесна з Міколам Купавам ім быў падрыхтаваны значны фотаальбом аб жыцці і дзейнасці Язэпа Драздовіча. У 2005 - 2007 гадах укладзены ілюстрацыі для трохтомнікаў, прысвечаных гісторыі ВКЛ. Аформлены шэраг фотаальбомаў ў выдавецтве "Беларусь", прысвечаных дзейнасці беларускіх мастакоў. Шэраг выданняў быў падрыхтаваны менавіта для музеяў, гэта тычыцца ілюстравання жыцця, дзейнасці і мастацкіх прац Напалеона Орды, а таксама фотаальбома "Гомельскі палац князёў Паскевічаў".

Мастак шмат працаваў сумесна з польскімі выдавецтвамі ў кірунку гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Яму давяраюць складаныя навуковыя праекты, дзе ён працуе ад самага пачатку да падпісання кнігі ў друк, з'яўляецца аўтарам канцэпцыі, дызайну са сваім капірайтам.

На ім ляжыць гістарычны падбор і канцэпцыя кожнай новай кніжкі, якая робіцца індывідуальна, не па шаблону.

Зміцер Герасімовіч неаднаразова быў узнагароджаны дыпломам 1 ступені за лепшае графічнае афармленне выданняў на Днях беларускага пісьменства і друку ў 2005, 2006, 2007 гадах.

- Акрамя таго, я з'ўляюся дызайнерам стылёвых фірмовых эмблемаў, здымаю краявіды, рарытэтныя экспанаты ў музеях Літвы, Польшчы і іншых еўрапейскіх краінаў,- падзяліўся сваім досведам Зміцер Герасімовіч.

У новай кнізе - 2000 ілюстрацыяў: адлюстравання гравюраў, старажытных мапаў, манетаў і пячатак, граматаў і лістоў. Тут упершыню змешчаны некаторыя архіўныя фотаздымкі айцоў-заснавальнікаў БНР. Для ілюстравання кнігі мастак выкарыстоўваў шмат прыватных калекцый замежных краін - Аўстрыі, Германіі і асабліва Польшчы і Літвы.

- Без прадстаўленых там твораў мастацтва і матэрыяльнай культуры спадчыны ВКЛ, без доступу ў архівы, музеі і бібліятэкі краін мы б не маглі прадставіць такі багаты матэрыял у нашай кнізе, - адзначыў Зміцер Герасімовіч.

У знакавы год, абвешчаны на Беларусі Годам кнігі, пісьменнікі і мастакі на высокім узроўні працягваюць справу Скарыны, памнажаюць спадчыну для нашчадкаў, захоўваюць нацыянальныя святыні дзяржаўнасці, як сімвал усёй тысячагадовай беларускай культуры.



*Э. Дзвінская.*

**На здымках:** 1-2. Зміцер Герасімовіч і Уладзімір Арлоў дзеляцца радасцю нараджэння кніжнага шэдэўра; 3. Пятро Краўчанка і яго ўнучкі атрымалі кнігі з падпісамі аўтараў. *Фота аўтара.*

Э. Дзвінская. У лепшых традыцыях кнігадрукавання